

Download

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

**Сем месяцаў трымалі на Акрэсціна. У Мінску палітзняволенага ўкраінца асудзілі да трох гадоў калоніі**

20 верасня ў судзе Заводскага раёна Мінска 33-гадовага палітзняволенага грамадзяніна Украіны **Міхаіла Феранца** асудзілі да трох гадоў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Феранца абвінавацілі ва ўдзеле ў трох леташніх Маршах, а таксама ў арганізацыі шляхам адміністравання тэлеграм-канала "Смелыя людзі" нанясення пратэстных надпісаў і малюнкаў, вывешвання БЧБ-стужак у дварах Фрунзенскага раёна Мінска.

Выхадца з Данецка, які ў Беларусі жыве ўжо дзевяць гадоў, затрымалі 16 верасня мінулага года, **сем месяцаў яго трымалі як замежніка ў чаканні высылкі з краіны ў ІЧУ на Акрэсціна**. Аднак замест адпраўкі на радзіму яму выставілі абвінавачванне і перавялі ў СІЗА-1. Пры гэтым у тэрмін пакарання сямімесячнае ўтрыманне на Акрэсціна яму не залічылі. Віну палітвязень **на судзе не прызнаў**, адмовіўся ад дачы паказанняў, але выступіў з моцным апошнім словам, у якім **распавёў, у тым ліку, пра псіхалагічны і фізічны гвалт з боку сілавікоў**, а таксама пра нечалавечыя ўмовы ўтрымання цягам гэтых месяцаў на Акрэсціна:

*"У ІЧУ адбываюць пакаранне "сутачнікі", а **сем месяцаў — гэта не сем сутак**. Сядзець з замежнікамі, якія дзяруцца за хлеб, потым іх раздымаеш, адзін з іх прымае цвёрдае рашэнне, што я на баку іншага, і ён перастае спаць па начах, чакае, калі я засну, і кладзецца ў ложак з зубной шчоткай з мэтай ці то засцерагчы сябе ад нейкага нападу, ці то, наадварот, пратыкнуць мне вока. Такое жыццё там ідзе 24 гадзіны на суткі. **Мусульмане дзяруцца там з хрысціянамі за месца для малітвы**. Хлопец мые туалет, падлогу, потым гэтай жа анучай мые стол. Радыё няма, тэлевізара няма, разетак няма. Хоць бы гарбату можна было прыгатаваць, але гэта таксама немагчыма. Нават гарбата туды не прапускаецца, дый запарыць яе там няма магчымасці. **Холад узімку быў такі, што заснуць можна было толькі апранутым у куртку і ваўняныя шкарпэткі".***

**Чытаць апошяе слова палітвязня цалкам** 👉 bit.ly/2Zgchsv
t.me/viasna96/7238
4.4K viewsSep 20, 2021 at 15:09

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.or
g/js/telegram-widget.js?
```

Copy